(вспомним хотя бы запрещение польским, а затем российским правительством употребления белорусского языка, отсутствие вплоть до 20-х гг. XX ст. развитой системы высшего образования), в Беларуси не сложилось всеобъемлющих философских и культурологических систем, типа кантовской, гегелевской или уайтовской. Но в философском наследии нашего народа ядро размышлений о сущности бытия составляет неподдельный интерес к человеку, его духовному миру, нравственным исканиям, к его жизненной судьбе. Эта траектория духовно-нравственного осмысления жизни и стремлений народа продолжается вплоть до настоящего времени во всех сферах современной белорусской культуры.

---


1. *Соловьев В.С.* Русская идея // Соловьев В.С. Соч.: в 2 т. – М., 1989. – Т.2. – С. 246–248.

2. *Багдановiч М.* Поўны збор твораў. – Мн., 1995. – Т. 3. – С. 125, 134, 237.

3. *Чорны К.* Збор твораў: у 8 т. – Мн., 1975. – Т. 8. – С. 72, 85.



**М.А.Бяспалая**, *прафесар*


## СУЧАСНАЕ АСЭНСАВАННЕ ПАДЗЕЙ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ Ў ІДЭАЛАГІЧНАЙ РАБОЦЕ

Дзяржава як структура, што фарміруе і кантралюе сацыяльна-эканамічнае і культурнае жыццё пэўнага этнасу на пэўнай тэрыторыі, не павінна ігнараваць такі важнейшы кірунак сваёй дзейнасці, як распрацоўку ідэалагічнай праграмы. Тэрмін “ідэалогія” быў уведзены ў XIX ст., і ва ўсе перыяды гісторыі чалавецтва кірунку дзяржаўнай палітыкі, абазначанаму гэтым тэрмінам, надавалася вялікае значэнне. У

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

канцэнтраваным выглядзе эвалюцыю ідэалагічнай парадыгмы можна ўявіць як пераход ад заклікаў: “Усё ў імя поліса” ці “Усё ў імя Рыма”, – да: “Божа, абарані караля ці імператара”, – урэшце да: “Усё ў імя Радзімы”. Змест ідэалагічнай работы выразна адлюстроўваў мэты канкрэтнага грамадства: праслаўленне подзвігаў сваіх грамадзян, прапаганду перавагі сацыякультурнага развіцця дадзенага грамадства. Як бачна, асноўнай задачай ідэалагічнай работы з’ўлялася, ды і будзе з’ўляцца, выхаванне патрыётаў сваёй радзімы.

Ва ўсходніх славян зафіксаваную пісьмова ідэю аб адзінстве плямён і ранняй усходнеславянскай дзяржавы, сфармуляваную манахам Нестарам, можна знайсці ў “Аповесці мінулых гадоў”. Успомнім, з якім абурэннем аўтар ставіцца да сепаратызму полацкага князя Усяслава Чарадзея. У сваю чаргу полацкі князь актыўна дзейнічаў у імя сваёй дзяржавы, яе пашырэння і ўзмацнення. Гэтая ідэя прасочваецца і ў палітыцы спадкаемцаў Усяслава, і ў падзвіжніцтве Ефрасінні Полацкай, і ў дзейнасці іншых насельнікаў Полацкай зямлі. Эвалюцыя Вялікага княства Літоўскага, наадварот, сведчыць аб падмене ідэі агульнадзяржаўнай ідэяй аднаго саслоўя – “залатых шляхецкіх вольнасцей”. Менавіта гэта, на наш погляд, стала адной з галоўных прычын аслаблення ВКЛ. У той час калі ў Маскоўскім княстве культывавалася ідэя “трэцяга Рыма”, у Вялікім княстве Літоўскім такой агульнадзяржаўнай ідэі не сфарміравалася. У новы час у Расійскай імперыі ідэалагічнай парадыгмай стала вядомая формула “самадзяржаўе, праваслаўе, народнасць”. У гэтых умовах беларускі этнас вуснамі вялікіх паэтаў агучыў сваю ідэю – “людзьмі звацца”, “... што чалавек я, хоць мужык”, а потым і мэту будучай дзяржавы – “...заняць пачэсны пасад між народамі”.

Сучаснае беларускае грамадства таксама развівае ідэалагічную работу, шукае яе галоўную дамінанту. Нам падаецца, што сучасныя падыходы да асвятлення падзей Вялікай Айчыннай вайны якраз і стануць важным падмуркам для

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выхавання патрыятызму, асабліва калі ўлічыць, што дзве трэці насельніцтва рэспублікі нарадзіліся пасля вайны. Галоўным у гэтых сучасных падыходах з'яўляецца разгляд ваенных падзей праз прызму агульначалавечых каштоўнасцей – любові да сваёй зямелькі і сямейкі, а не да партыі ці ўлады, увагі да лёсу канкрэтнага чалавека і яго павагі, а не да заклікаў пралетарскага інтэрнацыяналізму і інш.

Асноўнымі метадамі ідэалагічнай работы павінны стаць адказ на любое пытанне, праўдзівае тлумачэнне кожнай праблемы, супастаўленне розных, нават супрацьлеглых, поглядаў на падзеі вайны. Менавіта такія патрабаванні ставіць моладзь, і гэта дапамагае высветліць шмат праблемных пытанняў, дазваляе па-новаму асэнсаваць ход вайны. У той жа час гэта паказвае, што наша моладзь перажывае за Радзіму, хоча знайсці правільнае тлумачэнне ваеннай трагедыі і адказы на свае пытанні.

Курс "Вялікая Айчынная вайна савецкага народа", які ўведзены ў вучэбны план з верасня 2004 г., прадугледжвае разгляд Вялікай Айчыннай вайны ў кантэксце другой сусветнай, што дапамагае паказаць ролю пэўных дзяржаў у развязванні вайны, узровень ідэалагічнай апрацоўкі насельніцтва з пазіцыі кіруючых колаў еўрапейскіх краін. Відавочна, што большасць ваенных канфліктаў напярэдадні вайны ўзніклі не па віне СССР, хаця сёння назіраюцца актыўныя спробы абвінаваціць у гэтым СССР, паказаць агрэсіўнасць яго знешняй палітыкі. Перш за ўсё сказанае адносіцца да прац В.Суворава і І. Буніча. Сваю ролю гэтыя антысавецкія аўтары выканалі. Яны абудзілі крытычную думку, жаданне знайсці праўду, разабрацца ў трагедыі 1941 г. Як паказалі выкладанне курса "Вялікая Айчынная вайна савецкага народа", дыскусіі са студэнтамі, у тэме вайны няма ні адной падзеі, якая б не падлягала новаму асэнсаванню. Найбольш балючымі пытаннямі па-ранейшаму застаюцца пачатак вайны, прычыны трагедыі 1941 г. і партызанская барацьба.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Астатнія падзеі вайны, на наш погляд, для студэнтаў з'яўляюцца другараднымі. Пытанне "хто вінаваты?" будзе хваляваць яшчэ многія пакаленні, таму што спасцігнуць, адчуць усю глыбіню трагізму сітуацыі 1941 г. поўнасцю немагчыма. У якасці прыкладу працытуем ліст з 41-га: «Я был в окружении под городом Могилевом больше двух недель. Нам был отдан приказ умереть, а город отстоять. Но умереть не удалось, а также и город отстоять не пришлось, потому что у нас не было пищи и запаса снарядов. И мы стали пробираться сквозь окружение. Шли лесами, болотами, пробирались 8 суток без куска хлеба. Пили только болотную воду. Самое трудное у нас было – это когда переходили огневой рубеж. Он нас угощал из пулемёта. Много людей полегло и много осталось в плену». У другім лісце чытаем: "... наш корпус тысяч 6 бросил павших товарищей – убитых и раненых. Наш корпус разбит. Мы отступили. Много наших взято в плен и много (бросили) мы орудий, бронемашин... Ох, если бы вы знали, как тяжело: на сердце камень; как страшно переживать такие страшные картины...» [2, с.145–146]. Пісьмо – гэта лёс аднаго чалавека і ў той жа час самы выразны аргумент на карысць праўды аб вайне. І аўтары такіх пісем, і ўвесь народ мелі права ведаць праўду аб тым, чаму армія не змагла перамагчы ворага «малой крывёю», «на чужой тэрыторыі» і хто ў гэтым вінаваты.

У першыя дні вайны пачала распаўсюджвацца версія, агучаная І.В. Сталіным у прамове 3 ліпеня. Галоўная ідэя яе – нечаканасць і вераломнасць нападу фашысцкай Германіі, з канца 1942 г. да гэтага далучыцца заключэнне аб адсутнасці другога фронту, і толькі ў маі 1945 г. ён зазначыць, што ў нашага ўрада было шмат памылак.

Праз многа гадоў, у 1967 г., да гэтай версіі будзе дабаўлена выснова аб праліках у вызначэнні магчымага часу нападу і нанясення першых удараў. У.С.Пасэ ўспамінае, што пры падрыхтоўцы кнігі па гісторыі партызанскага руху была зроблена спроба дадаць да прычын катастрофы 1941 г. такія



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

радкі: «... а таксама той факт, што баявая падрыхтоўка, якая ажыццяўлялася да вайны, у асноўным была падпарадкавана засваенню прыёмаў і метадаў наступлення». Аднак правесці такую фармуліроўку не ўдалося [2, с.141–143].

У канцы 80-х гг. XX ст. быў знойдзены галоўны віноўнік трагедыі 1941 г. – Сталін, які, на думку аўтараў, дапусціў сур'ёзныя пралікі ў ацэнцы ваенна-палітычнага стану краіны і інш. Якое ж сучаснае тлумачэнне прычын катастрофы першых месяцаў вайны? Найбольш шырока яно пададзена ў артыкуле «Вялікая Айчынная вайна» ў другім томе «Гістарычнай энцыклапедыі». У ім называюцца некампетэнтнасць, нізкі прафесіяналізм, бескантрольнасць дзеянняў партыйна-савецкага кіраўніцтва, што сведчыла аб непадрыхтаванасці да абарончых баёў; знішчэнне найбольш таленавітых ваенных кадраў і правал дактрыны «любы вораг будзе маланкава знішчаны на сваёй тэрыторыі».

Менавіта такі падыход да тлумачэння прычын трагедыі 1941 г. дазваляе выкладчыку быць аптымальна праўдзівым, што выклікае давер і разуменне сярод студэнтаў, садзейнічае дасягненню пастаўленай мэты – выхаванню патрыятызму.

Немалаважнае значэнне ў гэтым плане маюць сведчанні ворага. Напрыклад, начальнік Генеральнага штаба сухапутных войск Германіі Ф.Гальдэр ужо 29 чэрвеня 1941 г. запісаў у сваім дзённіку: «У Польшчы і на Захадзе мы маглі дазволіць сабе некаторыя вольнасці і адступленні ад устаўных прынцыпаў; цяпер гэта недапушчальна» [1, с.65]. Гэты запіс – своеасаблівая ацэнка баёў у Беларусі, мужнасці яе абаронцаў. Ворагу было не зразумела, чаму нашы ішлі ў атаку ва ўвесь рост з вінтоўкамі наперавес і з крыкамі на кулямёты. Не зразумела і тое, чаму кідаліся з гранатамі пад танк ці шлі на таран варожых самалётаў.

Другая праблема, якая хвалюе студэнтаў, – арганізацыя партызанскага руху. Дзякуючы пашырэнню на бытавым узроўні ўяўлення аб партызанах галоўным чынам як

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рабаўніках, а не змагарах з ворагам, аб чым сведчаць працы студэнтаў на тэму “Мая сям’я ў вайне”, гэтая праблема вельмі вострая. Амаль у кожнай студэнцкай рабоце прысутнічаюць негатыўныя факты з гісторыі партызанскага руху. У гэтым мы бачым складаную і прынцыпова важную праблему, і не толькі ідэалагічную. Аказваецца, дзеці больш давяраюць сваім блізкім, а не навуковай аргументацыі. Толькі зварот да псіхалагічных асноў паводзін кожнага чалавека, да ўмоў, у якіх апынуліся тысячы маладых людзей на акупіраванай ворагам тэрыторыі, можа дапамагчы зняць вастрыню пытання, растлумачыць многія негатыўныя моманты.

Партызанскі рух стаў нечаканай з’явай як для германскага кіраўніцтва, так і для савецкага. Узнікненне супраціўлення на тэрыторыі СССР не падпадала пад стандарты нямецкага ўяўлення аб паводзінах насельніцтва на акупіраваных тэрыторыях, бо ў Заходняй Еўропе назіралася іншая карціна. Насельніцтва нашай краіны аказалася актыўным, арганізаваным, выступленні яго былі масавымі. Ніхто не мог нават у думках дапусціць, што на працягу шасці месяцаў вайны, па нямецкіх звестках, у палон трапяць 3,9 млн. чалавек, з іх 15,2 тыс. афіцэраў. У пачатку 1942 г. у лагерах ваеннапалонных засталіся 1,1 млн. чалавек, большасць з астатніх напаткаў трагічны лёс, а некаторыя рознымі шляхамі змаглі стаць партызанамі [1, с.73]. Відавочна, што партызанская барацьба пачыналася стыхійна, толькі ў маі 1942 г. у Маскве быў створаны Цэнтральны штаб партызанскага руху, а да гэтага былі прыняты некалькі дырэктыў па яго арганізацыі.

Нельга пакінуць па-за ўвагай тое, што адной з прычын вайны была ідэалагічная, адлюстраваннем чаго стала палітыка масавага знішчэння людзей, на першых парах палітработнікаў, пагранічнікаў, якіх нават не бралі ў палон. Генацыд пачаўся ў пчатаку акупацыі. Ужо з ліпеня 1941 г. карнікі пачалі лютаваць на Палессі і ў Цэнтральнай Беларусі. Аднак такая форма супакаення акупіраваных тэрыторый не прынесла жадаемых



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вынікаў. Ужо 25 кастрычніка 1941 г. галоўнакамандуючы нямецкіх сухапутных войскаў выдаў дырэктыву аб барацьбе з партызанамі. Праз год у Генеральнай акрузе "Беларусь" спецыяльным упаўнаважаным па барацьбе з партызанамі быў прызначаны Эрых фон Бах-Зелеўскі, які распрацоўваў план карных аперацый супраць партызан. У выніку ўся Беларусь была заліта крывёю, а аўтар плана не прадстаў нават перад міжнародным судом. Адначасова была разаслана дырэктыва аб пераходзе да генацыду і палітыкі "спаленай зямлі": «Пры любой форме супраціўлення ўсе бліжэйшыя пункты ў дадзеным раёне павінны быць спалены...» [2, с.160].

Былыя салдаты і афіцэры Чырвонай Арміі складалі аснову партызанскага руху, многія з іх ўзначалілі партызанскія атрады і брыгады і ўстанаўлівалі ўсю магчымую ў іх сілах уладу ў месцах сваёй дыслакацыі. Некаторыя з іх сталі прататыпамі літаратурных герояў, як, напрыклад, камандзір брыгады "Жалязняк", Герой Савецкага Саюза І.П.Ціткоў (прататып Івана Сударава, героя апавядання А.Талстога). А некаторых з ліку партызан успамінаюць нядобрым словам тыя, хто застаўся ў жывых.

Патрыятызм праяўляўся па-рознаму. Відавочна, што быў патрыятызм, афарбаваны ў савецкія ідэалагічныя колеры, аб гэтым маецца вялікая мастацкая і навуковая літаратура. Многія эпізоды вайны адлюстроўваюцца праз ідэалагічныя штампы накшталт "За партыю, за Сталіна!" Існавала і супрацьлеглае: "За Радзіму, але без Сталіна". Не звяртаць увагу на наяўнасць гэтай старонкі вайны немагчыма, калі мы імкнемся да праўды аб ёй, таму што менавіта такі патрыятызм быў уласцівы сотням тысяч людзей, якія ў той ці іншай форме супрацоўнічалі з ворагам. На наш погляд, дасягненне нават такой высакароднай мэты, як свабода Радзімы ў саюзе з яе злейшым ворагам, не можа лічыцца патрыятычным учынкам.

Як складана ішлі людзі да разумення свайго абавязку перад Радзімай, сведчыць лёс аднаго з падраздзяленняў Рускай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нацыянальнай народнай арміі, так званых "народнікаў", якое ўзначальваў былы савецкі палкоўнік В.В. Гіль-Радыёнаў. 16 жніўня 1943 г. у поўным складзе, каля 1,5 тыс. чалавек, падраздзяленне перайшло на бок партызан і стала 1-й Антыфашысцкай партызанскай брыгадай. Яна вызначылася ў баях, якія вялі партызаны Полацка-Лепельскай зоны вясною 1944 г. Брыгада першай пашла на прарыў, у жывых засталіся каля 400 чалавек, загінуў і камандзір, пасмяротна ўдастоены ордэна Чырвонай Зоркі.

Абвастрылася пачуццё патрыятызму і сярод эмігрантаў першай хвалі, чаму ёсць мноства прыкладаў. У в. Галынка (каля Асіповіч) дыслацыраваўся трэці эскадрон Казацкага добраахвотнага палка. У чэрвені 1943 г. на бок партызан перайшла група казакоў на чале з намеснікам камандзіра эскадрона князем М.М.Гагарыным. Ён заявіў, што "не можа больш пераносіць здзекаў... над народам, якія праводзяць немцы". Не сталі супрацоўнічаць з немцамі М.Цвятаева, Л.Караваева-Кузьміна і інш.

Аднак галоўная роля ў перамозе належала непрыметным салдатам, працаўнікам тылу, жанчынам. Менавіта таму ацэньваць падзеі Вялікай Айчыннай вайны можна і патрэбна пад такім вуглом гледжання: "Подзвігу народа жыць вечна" (ці "Подзвіг народа бессмяротны"). Гэты кірунак можа быць тым сродкам, які зробіць больш эфектыўным ідэалагічную работу, таму што чым дакладней нашы веды аб падзеях вайны, тым больш велічна паўстае подзвіг народа. Велічны ён не таму, што хтосьці вельмі ўмела ці дасканала ведаў, як забіць ворага ці забіў яго, а таму, што ў час цяжкіх выпрабаванняў салдат застаўся чалавекам, з самымі лепшымі пачуццямі да Радзімы, сваёй зямелькі і сямейкі, з павагай да аднапалчан. Мабыць, самым абагульняючым вобразам салдата можна лічыць Васіля Цёркіна, неармейскасць якога з'яўляецца яго характэрнай рысай. Вайна для Цёркіна ў першую чаргу работа, якая непарыўна звязана з рызыкай для жыцця. Такому тлумачэнню



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вобраза салдата ёсць грунтоўная падстава, таму што на фронце ваявалі ў большасці ўчарашнія сяляне, якія захавалі моцную псіхалагічную сувязь са сваёй малой радзімай, карысталіся здабыткамі народнай культуры, навыкамі і ўменнем традыцыйнага, у многіх выпадках яшчэ патрыярхальнага жыцця і якія змаглі адкінуць усе крыўды ў імя галоўнай мэты. Чалавека, што моцна звязаны з зямлёй і традыцыяй, не так лёгка і перамагчы.

На нашу думку, гэтая акалічнасць можа лічыцца адной з галоўных прычын перамогі над ворагам. Больш-менш абучаная армія амаль поўнасцю загінула ў баях 1941 г., і асноўны цяжар вайны выпаў менавіта на цывільных людзей – учарашніх сялян, рабочых, інтэлігенцыю. Перад вайной 67,5 % усяго насельніцтва складалі вясковыя жыхары, больш 60 % загінуўшых – сяляне, яны ж склалі каля 60% тых, хто атрымаў званні Героя Савецкага Саюза, двойчы Героя Савецкага Саюза. Менавіта насуперак палітычным, стратэгічным пралікам кіраўніцтва народ выстаяў у страшнай барацьбе. Дзякуючы самаадданасці мільёнаў на фронце, у савецкім і варожным тыле вайна стала Айчыннай, і была атрымана перамога. Подзвіг народа на самай справе бессмяротны, і наша задача – праўдзіва паказаць яго веліч як у дні паражэнняў, так і ў дні перамог.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

---

1. *Война и общество,* 1941–1945: в 2 кн. / отв. ред. Г.Н.Севостьянов; И-нт российской истории. – М.: Наука. – Кн.1. – 2004. – 480 с.

2. *Уладзімір Пасэ.* Гісторык у гісторыі / адк. рэд. Н.У.Самерсава, К.І.Козак. – Мн.: НАРБ, 2004. – Вып.1. – 272 с.